Механічны цэх галоўнага вытворчага корпуса завода.

(Башкірская АССР), у снеж. 1944 пераведзены ў Віцебск. Выпускаў заточныя і металарэзныя станкі. У 1969 вытв. прадукцыі ў 4,7 раза перавысіла ўзровень 1950. На з-дзе асвоена больш за 50 універсальных і 100 спец. мадэляў станкоў. Яны экспартуюцца больш чым у 30 краін свету, у т. л. ў Вялікабрытанію, Францыю, Швецыю, Індыю, Алжыр, Румынію і інш. (1969). Прадукцыя экспанавалася на міжнар. выстаўках і кірмашах (ГДР — 1967; Польшча, Францыя, Бразілія — 1968; ГДР, Югаславія, Новая Зеландыя — 1969; ГДР, Югаславія, Чэхаславакія, Пакістан, Сінгапур — 1970). Пасля рэканструкцыі (пачата ў 1966) вытв. плошча павялічыцца ў 8 разоў, а аб'ём прадукцыі ў 2,3 раза. Пры з-дзе паліклініка, 2 б-кі, піянерскі лагер, дзіцячы сад. *Б. М. Півавaронак.* Віцебск.

ВІЦЕБСКІ «КАЦЁЛ», аперацыя войск 3-га Бел. і 1-га Прыбалт. франтоў у Айч. вайну па знішчэнні акружаных пад Віцебскам 5 ням. дывізій 53-га армейскага корпуса. У ходзе *Віцебска-Аршанскай аперацыі 1944* 25 чэрв. каля в. Гняздзілавічы 43-я і 39-я сав. арміі замкнулі кола акружэння віцебскай групоўкі праціўніка. 26 чэрв. «кацёл» разрэзаны на 2 ачагі: на ПдЗ ад Віцебска каля в. Башні і ў выгіне р. Зах. Дзвіна каля в. Лукі. Праціўнік 20 разоў контратакаваў пазіцыі 164-й і 17-й гвардз. стралк. дывізій. Варожая група да 8 тыс. чал. прарвалася ў раён в. Стайкі, утварыўшы 3-і ачаг акружэння. 26—27 чэрв. сав. войскі сціснулі кола акружэння і прымусілі ворага скласці зброю. У палон узята больш за 10 тыс. чалавек. Рэшткі варожых часцей, якія супраціўляліся, 28 чэрв. знішчаны.

ВІЦЕБСКІ ЛЁТАПІС, помнік гістарыяграфіі Беларусі 18 ст.

Складзены ў 1768 жыхаром Віцебска Сцяпанам Аверкам на аснове віцебскага летапісу Міхала Панцырнага за 896—1709, кароткіх гістар. запісаў Чарноўскіх за 1601—1733, Гаўрылы Аверкі (бацька С. Аверкі) за 1733—57 і матэрыялаў, сабраных аўтарам. Звесткі да канца 16 ст., якія датычацца рус., польскай, сусв. гісторыі і часткова Вял. кн. Літоўскага, запазычаны з рус. летапісаў і польскіх хронік. У В. л. значная колькасць арыгінальных звестак з гісторыі Беларусі і Віцебска, асабліва пра ваенна-паліт. падзеі канца 17 — пач. 18 ст. У канцы летапісу спісы членаў віцебскага магістрату 1597, віцебскіх ваявод за 1516—1753 і інш. гісторыка-юрыд. матэрыялы. В. л.— важная крыніца вывучэння польска-рус. і рус.-шведскіх узаемаадносін. Форма выкладу традыцыйная летапісная — кароткія пагадовыя запісы інфармацыйнага характару.

Публ.: Сапунов А. (сост.). Витебская старина, т. 1, Витебск, 1883; Сборник летописей, относящихся к истории Южной и Западной Руси..., Киев, 1888. *В. А. Чамярыцкі.* Мінск.

ВІЦЕБСКІ МАСТАЦКІ ТЭХНІКУМ, навуч. ўстанова ў Віцебску ў 1923—39. Засн. на базе навуч. маст. устаноў: Нар. маст. школы (1918—20, створана на аснове *Віцебскай школы Пэна*), Віцебскіх маст. майстэрняў (1920—21), Віцебскага мастацка-практ. ін-та (1921—23). У 1939 тэхнікум рэарганізаваны ў Віцебскае маст. вуч. (існавала да 1941). Аддз.: жывапісу і скульптуры; у 1925 створана таксама аддз. керамікі, у 1934 пед., маст.-афарміцельскае, мастацка-графічнае. У маст. навуч. установах г. Віцебска выкладалі мастакі-рэалісты І. Ахрэмчык, А. Бразер, В. Волкаў, М. Дабужынскі, В. Дзежыц, М. Керзін, Л. Лейтман, Я. Мінін, М. Міхалап, Ю. Пэн, У. Хрусталёў, М. Эндэ і інш., вучыліся З. Азгур, А. Арлоў, А. Бембель, А. Волкаў, П. Гаўрыленка, А. Глебаў, А. Жораў, Я. Зайцаў, П. Масленікаў, М. Савіцкі, У. Сухаверхаў, В. Цвірка і інш. бел. мастакі. У пач. 20-х гадоў сярод выкладчыкаў была група мастакоў-фармалістаў (М. Шагал, К. Малевіч і інш.), якія ў сваёй пед. практыцы і творчасці выступалі супраць рэалістычных традыцый у мастацтве; творчасць і пед. метады іх асталіся чужымі сав. народу.

Літ.: Машковцев И. Изобразительное искусство Белоруссии, у кн.: Искусство Советской Белоруссии, М.— Л., 1940; Орлова М. Искусство Советской Белоруссии, М., 1960. *М. І. Красоўскі.* Мінск.

ВІЦЕБСКІ МЕДЫЦЫНСКІ ІНСТЫТУТ, вышэйшая навуч. ўстанова. Засн. ў 1934 у Віцебску як бальніца-медінстытут; у 1938 перайменаваны ў Віцебскі мед. ін-т. Рыхтуе ўрачоў і правізараў. Ф-ты ў 1970/71 навуч. г.: лячэбны, фармацэўтычны. Аспірантура з 1960. Мае н.-д. лабараторыю, б-ку. У 1970/71 навуч. г. займалася 2605 студэнтаў.

У 1970 на 42 кафедрах працавала 264 выкладчыкі, у т. л. 15 праф. і д-роў н., 132 дацэнты і канд. н. Прафесары і д-ры н.: Л. І. Багдановіч, У. М. Велічэнка, М. У. Вінаградаў, А. М. Давыдаў, Ю. Л. Дазоран, А. М. Дзямецкі, З. І. Ібрагімава, Дз. С. Кавалёў, М. Ф. Лызікаў, А. І. Рэзнікаў, І. Л. Сасновік, М. М. Смірноў, А. І. Франкфурт, М. М. Янчур, А. П. Яфімцава. Рэктар канд. мед. н. Я. Н. Мядзведскі (з 1966).

Асн. даследаванні ў галіне фізіялогіі і паталогіі сардэчна-сасудзістай, дыхальнай і

Галоўны корпус Віцебскага медыцынскага інстытута.

стрававальнай сістэм, паталогіі залоз унутр. сакрэцыі, анкалогіі, абмену мікраэлементаў. Прымае да абароны канд. дысертацыі. Выдае зборнікі навук. прац.

Літ.: Медведева Г. А. 30-летие Витебского медицинского института, у кн.: Сборник научных трудов Витебского государственного медицинского ин-та, в. 11, Мн., 1964; Медведский Е. Н. Витебский государственный медицинский институт к 50-летию Октября, там жа, в. 12, Мн., 1968.

Я. Н. Мядзведскі. Віцебск.

ВІЦЕБСКІ НАСТАЎНІЦКІ ІНСТЫТУТ, 1) навуч. ўстанова ў дарэвалюцыйнай Беларусі. Рыхтаваў настаўнікаў гарадскіх пач. вуч. і вышэйшых пач. школ. Адкрыты 1.7.1910 у Віцебску. Прымаліся асобы, якія скончылі настаўніцкія семінарыі, а таксама са званнем настаўніка пачатковых вуч. і 2-гадовым пед. стажам. Тэрмін навучання 3 гады. Пры ін-це існавалі гар. вучылішча і клас ручной працы; курсы настаўнікаў чыстапісання, гімнастыкі, жаночыя пед. курсы. Выпускнікі набывалі пед. і метадычную падрыхтоўку, але агульнаадук. ўзровень яе быў невысокі. Падрыхтаваў 50 настаўнікаў; у 1918 закрыты ў сувязі са стварэннем *Віцебскага педагагічнага інстытута.* 2) Навуч. ўстанова ў 1944—54 пры Віцебскім педагагічным інстытуце. Тэрмін навучання 2 гады. Аддзяленні: фізіка-матэматычнае, біялагічнае, мовы і л-ры. У 1954 аб'яднаны з Віцебскім пед. ін-там.

Э. М. Савіцкі. Мінск.

ВІЦЕБСКІ ПАДПОЛЬНЫ АБКОМ КП(б)Б у гады Вялікай Айчыннай вайны, цэнтр кіраўніцтва парт. падполлем і партыз. рухам на тэр. Віцебскай вобл. ў час ням.-фаш. акупацыі. Паводле рашэння ЦК КП(б)Б распачаў дзейнасць у сак. 1942. Сакратары: І. А. *Стулаў*, Я. А. *Жылянін*, І. Б. *Пазнякоў* (з ліст. 1942), М. І. *Пліс* (з крас. 1943); члены бюро: І. М. *Рабцаў*, В. І. *Лузгін*, М. П. *Шмыроў* (з вер. 1943) і інш. Друкаваны орган газ. *«Віцебскі рабочы»* (чэрв. 1942 — чэрв. 1944, перыядычнасць 1—2 разы на тыдзень, тыраж да 15 тыс. экз., рэд. В. Е. Самуцін, з крас. 1943 А. С. Крушынскі). Размяшчаўся ў в. Бор, Номеры, Есінавец (Усвяцкі р-н), в. Бяляева (Веліжскі р-н), в. Веляшковічы (Лёзненскі р-н). За час дзейнасці стварыў Віцебскі падпольны гарком (сакратар В. Р. Кудзінаў) і 20 райкомаў КП(б)Б (на 1.9.1943), якія аб'ядноўвалі 389 пярвічных парт. арг-цый, 2735 камуністаў (гл. *Раённыя падпольныя камітэты КП(б)Б*. 16 райкомаў выдавалі газеты. Пад кіраўніцтвам В. п. а. КП(б)Б дзейнічаў Віцебскі падпольны абком ЛКСМБ (сак. 1942 — чэрв. 1944, сакратары Лузгін і Ф. А. Башкінцаў), Віцебскі падпольны гарком і 20 райкомаў ЛКСМБ, якія аб'ядноўвалі 523 пярвічныя арг-цыі (6302 камсамольцы). З 1942 у вобласці дзейнічала 5 партыз. зон (Суражская, Расонская, Полацкая, Ушацкая, Сенненская), у якіх пастаянна знаходзіліся сакратары і члены бюро В. п. а.

Падпольны абком накіроўваў дзейнасць *Віцебскага камуністычнага падполля* і 37 партыз. брыгад на тэр. Віцебскай вобл.: 1-й Бел. (крас. 1942 — кастр. 1943), 1-й Бел. (кастр. 1943 — чэрв. 1944), «Аляксея» (імя Данукалава), 2-й Бел. імя Панамарэнкі (май 1942 — сак. 1943), 2-й Бел. імя Панамарэнкі (кастр. 1943 — чэрв. 1944), Расонскай імя Сталіна, імя Чапаева, імя Кароткіна, 3-й Бел., 1-й імя Заслонава, 2-й імя Заслонава, Чашніцкай брыгады Дубава, Гудкова, 1-й Дрысенскай, Асвейскай імя Фрунзе, «Граза», імя Чырванасцяжнага Ленінскага камсамола (кастр. 1942 — жн. 1943), імя ВЛКСМ (жн. 1943 — чэрв. 1944), імя Кутузава, «За Сав. Беларусь», Сенненскай брыгады Лявонава, імя Варашылава, імя Леніна, 1-й Віцебскай (студз. 1943 — кастр. 1943), 1-й Віцебскай, Лёзненскай, Лепельскай імя Сталіна, імя Панамарэнкі, Стралкова, Багушэўскай, 2-й Дрысенскай, 1-й Смаленскай, палка Садчыкава, 16-й Смаленскай, «Няўлоўныя», імя Ракасоўскага, Асобай Бел. дывэрсійнай імя Леніна. (Пра партызанскія брыгады гл. адпаведныя артыкулы.) Усяго каля 40 тыс. узброеных партызанаў. 19 партызанам і падпольшчыкам прысвоена званне Героя Сав. Саюза: Ф. Ф. *Азміцелю*, А. С. *Бычку*, П. А. *Галецкаму*, А. Ф. *Данукалаву*, Ф. Ф. *Дубровскаму*, К. С. *Заслонаву*, І. К. *Захараву*, Е. С. *Зяньковай*, У. Е. *Лабанку*, Т. С. *Марыненцы*, П. М. *Машэраву* (за баявыя подзвігі ў Віцебскай і Вілейскай абл.), В. Л. *Няклюдаву*, З. М. *Партновай*, М. С. *Пруднікаву*, П. М. *Рамонаву*, М. Ф. *Сільніцкаму*, У. А. *Хамчаноўскаму*, В. З. *Харужай*, М. П. *Шмырову*.

М. І. Пахомай. Мінск.

ВІЦЕБСКІ ПАЛАЦ ГУБЕРНАТАРА, помнік класіцызму. Пабудаваны (да 1772) на высокім узгорку над Зах. Дзвіной. Дамінанта

Уверсе — цэнтральны і бакавы фасады Віцебскага палаца губернатара. Унізе — схема плана палаца (злева) і план галоўнага корпуса.

ансамбля, у які ўваходзяць плошча з абеліскам у памяць разгрому напалеонаўскіх войск пад Віцебскам у 1812 (1912, арх. І. Фамін). Будынак палаца ў мінулым аб'ядноўваў службовыя памяшканні і жылыя пакоі і меў унутраны двор складанай канфігурацыі. Вызначаецца строгасцю вонкавай кампазіцыі, скупым арх. дэкорам. Аспоўны (наўн.) трохпавярховы корпус мае вялікі норцік з чатырма наўкалонамі, які выходзіць на плошчу. Бакавы корпус, што павернуты на Зах. Дзві-